**Завяршыўся прыём у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Надышоў час для аналізу вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання. У першую чаргу хацелася б звярнуць увагу на некаторыя важныя асаблівасці арганізацыі і правядзення ўступных іспытаў у 2011 годзе, а таксама на ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў і яго дынаміку.**



# Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання: нататкі арганізатара

З мэтай удасканалення тэхналогіі цэнтралізаванага тэсціравання ў бягучым годзе была разгорнута аўтаматызаваная сістэма рэгістрацыі абітурыентаў. Нагадаю, што ў мінулым годзе мы пратэсціравалі гэтую праграму толькі ў 46 пунктах рэгістрацыі.

Безумоўна, у нас была не адна прычына для хвалявання напярэдадні рэгістрацыі: а ці не падвядуць каналы сувязі паміж усімі 72 пунктамі рэгістрацыі, ці зможа праграма выправіць магчымую памылку аператара ў патрэбны момант (адначасова працавала больш за 500 станцый рэгістрацыі), наколькі сістэма абаронена ад магчымага доступу пабочных асоб?

Кожная з гэтых, на першы погляд, не зусім сур'ёзных праблем магла не толькі дыскрэдытаваць новаўвядзенне, але і паставіла б пад пагрозу арганізацыю іспытаў з самага іх пачатку.

Разгортванне новай сістэмы поўнасцю аўтаматызавала працу пунктаў рэгістрацыі, дазволіла скараціць час на рэгістрацыю аднаго абітурыента і, што вельмі важна, перавесці на новы ўзровень бяспекі, надзейнасці, аператыўнасці ўвесь працэс рэгістрацыі.

Вартасці новай сістэмы рэгістрацыі абітурыентаў можна паказаць, правёўшы наступную аналогію: уявіце, што, знаходзячыся ў касе аўтавакзала горада Смаргоні, вы можаце набыць білет з Мазыра да Гомеля за тыдзень да плануемай паездкі. Менавіта такую магчымасць мелі абітурыенты падчас рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне — зарэгістравацца на ўсе тры іспыты, не пакідаючы свайго горада, нават пры ўмове, што абітурыент жадаў трымаць кожны з іх у трох розных гарадах.

У першыню за час існавання цэнтралізаванага тэсціравання колькасць паступаючых у параўнанні з мінулым годам зменшылася на 23 312 чалавек, усяго ў 2011 годзе было зарэгістравана 150 175 чалавек. Склад прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі змяніўся нязначна: 63,8% — гэта выпускнікі бягучага года розных тыпаў навучальных устаноў, астатнія абітурыенты атрымалі сярэднюю адукацыю ў папярэднія гады. Адрозненне ў суадносінах гэтых груп у параўнанні з мінулым годам знаходзіцца ў межах 2—3%. Тут трэба адзначыць паступовае зніжэнне колькасці замежных грамадзян, што прымаюць удзел у цэнтралізаваным тэсціраванні. Параўнайце: 2010 год — 514 чалавек, 2011 — 468 чалавек, з якіх 383 абітурыенты — грамадзяне Расійскай Федэрацыі.

Статыстычныя даныя за апошнія гады сведчаць аб тэндэнцыі змяншэння колькасці абітурыентаў, якія выбіраюць беларускую мову ў якасці экзамену па адной з дзяржаўных моў, і колькасці абітурыентаў, што здаюць прадметы на беларускай мове. Сёлета толькі 35,5% паступаючых аддалі перавагу нацыянальнай мове, у мінулым годзе — 40%. У 2005 годзе суадносіны беларускай і рускай моў былі блізкімі да парытэту. Тэсты па гісторыі Беларусі на роднай мове пажадалі выконваць каля трэці абітурыентаў ад колькасці ўсіх экзаменуемых па гэтым прадмеце. Па астатніх прадметах і таго менш: толькі 5—6% паступаючых здавалі экзамены на беларускай мове (у 2010 годзе — 9,4%). Выбар на карысць рускай мовы відавочны.

Стварэнне ў свой час у кожным абласным горадзе рэспублікі рэгіянальных цэнтраў тэсціравання на базе ўніверсітэтаў і іх сённяшні станоўчы вопыт з'яўляюцца гарантыяй якаснай арганізацыі цэнтралізаванага тэсціравання на пэўных яго этапах.

Тое, што 100-тысячны горад можна размясціць у аўдыторыях навучальных устаноў да 11 гадзін раніцы, нават уявіць няпроста. А між тым менавіта такую колькасць экзаменуемых арганізацыйныя камісіі пунктаў тэсціравання і нашы калегі з рэгіянальных цэнтраў размяшчалі на асобных іспыты (матэматыка, руская мова) адначасова. Пры гэтым трэба ўлічыць і своечасовую дастаўку матэрыялаў (бланкі адказаў, варыянты тэставых заданняў, папера для рабочых запісаў) для кожнага ўдзельніка іспытаў у больш чым 2 тысячы аўдыторый.

Не можа застацца незаўважаным такі станоўчы момант у арганізацыі і правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання, як значнае змяншэнне з кожным годам спроб абітурыентаў парушыць правілы ўдзелу ў іспытах. І, на мой погляд, у гэтай заканамернасці ёсць свае прычыны.

Самая важная з іх — стварэнне і праца Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Зладжанасць дзейнняў удзельнікаў уступнай кампаніі на ўсіх яе этапах дасягаецца дзякуючы ўдзелу ў гэтым працэсе дзяржаўнай камісіі. Як адказнасць арганізатараў тэсціравання, так і дысцыплінаванасць паступаючых, якія стараюцца не парушаць існуючых правіл, самым непасрэдным чынам залежаць ад ролі дзяржаўнай улады ў кантролі за ходам уступных іспытаў.

Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання 2011 і папярэдніх гадоў сведчаць аб захаванні пераемнасці амаль па ўсіх паказчыках.

Так, розніца сярэдніх значэнняў (у балах) 2011 і 2010 гадоў па беларускай мове складае 0,26 бала, па гісторыі Беларусі — 0,13 бала, па замежных мовах — 0,10—0,30 бала, па матэматыцы — 0,20 бала, па фізіцы — 0,50 бала.

Захаваліся тыя ж суадносіны паміж абсалютна высокімі і абсалютна нізкімі значэннямі па ўсіх прадметах.

У гэтай сувязі важна адзначыць вартасці методыкі разліку тэставага бала, якая выкарыстоўваецца інстытутам і забяспечвае аб'ектыўнае вымярэнне ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў на аснове выкананых імі пры стандартных умовах тэстаў.

У аснову методыкі пакладзена стабальная шкала мадыфікаваных першасных балаў. Яна дазваляе не толькі вызначыць колькасць правільных адказаў, але і ўлічыць ступень складанасці кожнага выкананага ці нявыкананага абітурыентам задання.

Улічваючы тое, што дадзеная методыка не выкарыстоўваецца ва ўстановах адукацыі нашай краіны, не зусім карэктным будзе параўноўваць вынікі тэсціравання (па сярэднім значэнні тэставага бала) з вынікамі вучэбнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі, дзе ў аснову пакладзены нарматыўна-арыентаваны падыход.

Тут важна даць параду бацькам абітурыентаў і настаўнікам. Памятайце, што сярэдні бал не з'яўляецца ні пунктам адліку, калі размова ідзе пра ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў, ні кульмінацыяй ва ўсёй працы, калі мы аналізуем вынікі тэсціравання. Гэта не той выпадак, калі нейкая сярэдняя лічба характарызуе якасны склад удзельнікаў іспытаў. Пры неаднародным складзе тэсціруемых сярэдні бал не вызначае ўзроўню падрыхтоўкі як тых, хто знаходзіцца ў ніжняй частцы рэйтынгавага спіса, так і лідараў.

Нашы даследаванні ўплыву дадатковай падрыхтоўкі выпускнікоў сярэдніх школ 2011 года на вынікі ўступных іспытаў выявілі наступную іерархію яе форм.

Вынікі тэсціравання абітурыентаў, якія наведвалі індывідуальныя заняткі з настаўнікамі, мелі найбольшыя станоўчыя адхіленні ад сярэдніх значэнняў. Па матэматыцы, напрыклад, іх сярэдні бал вышэйшы за агульны сярэдні на 8,69 бала, па рускай мове — на 11,02 бала.

Тыя з абітурыентаў, хто аддаў перавагу факультатыўным заняткам, значна ўступілі па выніках тэсціравання першым. Адхіленні па пэўных прадметах хоць і станоўчыя, аднак не такія істотныя: 2,79 бала — па рускай мове і 4,04 бала — па беларускай мове.

І зусім нязначнае адхіленне ад сярэдняга значэння (у межах 1 бала) назіраецца ў выніках тых паступаючых, хто займаўся на розных курсах пры вышэйшых навучальных установах.

Выпускнікі навучальных устаноў па выніках цэнтралізаванага тэсціравання ў той ці іншай ступені адрозніваюцца па ўзроўні падрыхтоўкі. Рэйтынг навучальных устаноў некалькі гадоў запар застаецца нязменным. Лепшыя вынікі дэманструюць выпускнікі ліцэяў, ім крыху ўступаюць навучэнцы гімназій.

Выключэнне ў размеркаванні сярэдніх значэнняў балаў складаюць замежныя мовы. Тут часцей сертыфікаты з самымі высокімі баламі атрымліваюць гімназісты. Яно і зразумела. У гімназіях грунтоўная падрыхтоўка па замежных мовах вядзецца на сярэдняй ступені адукацыі (5—9 класы). У ліцэях жа навучанне ідзе ўжо на трэцяй ступені, калі ёсць магчымасць толькі часткова ліквідаваць некаторыя прабелы ў ведах, атрыманых у іншых навучальных установах, і сістэматызаваць іх.

Наступную пазіцыю па выніках уступных экзаменаў займаюць выпускнікі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, далей ідуць абітурыенты, якія закончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (каледжы). Замыкаюць рэйтынгавы спіс выпускнікі прафесійна-тэхнічных вучылішчаў.

Асабліва значнымі трэба прызнаць адрозненні паміж дасягненнямі выпускнікоў гімназій, ліцэяў і вынікамі выпускнікоў каледжаў, ПТВ. Так, калі ліцэісты па рускай мове маюць сярэдні бал 54,32, то выпускнікі каледжаў — 23,25, выпускнікі ПТВ — 17,3; па матэматыцы — 48,15, 15,39 і 12,01 адпаведна.

Акрамя таго, выпускнікі ССНУ і ПТВ паказалі вынікі, ніжэйшыя за значэнні генеральнай сукупнасці ўсіх удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання.

Розніца паміж вынікамі выпускнікоў сельскіх і гарадскіх навучальных устаноў у гэтым годзе невялікая, а па геаграфіі, беларускай, нямецкай і іспанскай мовах мы адзначаем нават крыху лепшую падрыхтаванасць сельскіх выпускнікоў у параўнанні з падрыхтаванасцю тых, хто мае гарадскую прапіску.

Аналіз вынікаў тэсціравання бягучага года паказвае, што сярэдні бал абітурыентаў, якія залічаны на дзённыя аддзяленні вышэйшых навучальных устаноў для навучання за кошт сродкаў бюджэту, высокі. Па абсалютнай большасці прадметаў ён у два разы вышэйшы за сярэдні бал па гэтых дысцыплінах ўсяго кантынгенту экзаменаваных, а ў тых, хто паступае на прэстыжныя спецыяльнасці — у тры-чатыры разы.

Гэта сведчыць аб добрым якасным складзе студэнцкай аўдыторыі па ўказаных спецыяльнасцях.

**Мікалай ФЯСЬКОЎ,**
**дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.**
**Фота БелТА.**